ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
16
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 14(1535)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Камуністычнаму суботніку — ударную працу!







Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### ПАЧАЎСЯ АГЛЯД-КОНКУРС

мастацкай самадзейнасці сярод замежных навучэнцаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Учора адбыліся канцэрты студэнтаў факультэтаў журналістыкі і механіка-матэматычнага. Сёння выступяць студэнты хімічнага (пачатак — у 19.00) і фізічнага (20.00) факультэтаў, а 23 красавіка — падрыхтоўчага (16.00), філалагічнага (17.00) і гістарычнага (18.30) факультэтаў. Канцэрты праходзяць у актавай зале галоўнага корпуса, адказны за правядзенне конкурсу — выкладчык філалагічнага факультэта А. Атаманаў.

Узнагароджанне лаўрэатаў адбудзецца на заключным канцэрце 28 красавіка, які пройдзе ў Доме настаўніка (пачатак — 19.00). Тут жа, каля Дома настаўніка, у 17 гадзін пачнецца палітычны кірмаш. Пра білеты можна спытаць у камітэце камсамола універсітэта.

Запрашаем падтрымаць сваіх аднакурснікаў, удзельнікаў агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці сярод замежных навучэнцаў БДУ.

Ж. КРУГЛІКАВА.

### ПРАЦЯГВАЕЦЦА ЦЫКЛ

лекцый «Мода і дэкаратыўная касметыка». Нядаўна адбылася лекцыя «Састаўныя прыгажосці. Фізічная актыўнасць, харчаванне». 27 красавіка будзе прачытана чарговая лекцыя «Дэкаратыўная касметыка. Макіяж. Яго віды і прызначэнне. Мода-87». Лекцыя суправаджаецца паказам слайдаў. Чытае яе вядомы майстар па дэкаратыўнай касметыцы, прызёр міжнароднага конкурсу касметолагаў сацыялістычных краін Л. В. Лабуціна. Лекцыя цікавая не толькі для прыгожай паловы. Білеты можна набыць перад пачаткам.

А. САЎЧЫК.

### МЕСЯЧНІК

па барацьбе з курэннем праводзіцца ва універсітэце з 5 красавіка па 5 мая.

Ю. ПОЗНЯК.

### НА СВЯТА

да сваіх сяброў прыйдуць савецкія студэнты, каб адзначыць разам з афганскімі навучэнцамі дзень Красавіцкай рэвалюцыі. Вечар адбудзецца 25 красавіка ў актавай зале галоўнага корпуса.

В. ЯЦКОЎСКІ.

### ПЕРШЫНСТВО

універсітэта сярод вучэбных груп па міні-футболу вызначыла лепшыя каманды. Першае месца заняла футбольная каманда факультэта радыёфізікі, II - фізічнага факультэта, III — ФПМ.

А. СЦЯПАНАЎ.

*Пазыўныя трэцяга працоўнага*

## Хутка ў дарогу

Дзесяць год вецер юнацтва і маладосці дзьме ў гэтыя ветразі. Не адзін дзесятак студэнтаў ФПМ прайшоў школу СБА «Пунсовыя ветразі».

ДОБРАЕ І ЦІКАВАЕ запамінаецца заўсёды надоўга. Цяпер, калі «Пунсовыя ветразі» рыхтуюцца да новага працоўнага семестра, лета-86 успамінаецца асабліва часта. Успамінаецца ўсё лепшае. Вопыт папярэднікаў бярэцца на ўзбраенне.

Асаблівы гонар выпаў на долю байцоў 1986 года. У састаў атрада былі ўключаны замежныя студэнты. На малдаўскіх палях побач з намі працавалі юнакі з Анголы, Індыі, Афганістана. Мы стараліся працаваць, адпачываць так, каб нашы госці запомнілі, як весела, дружна і цікава можна правесці сваё студэнцкае лета. Не забыць нам вечар знаёмства, прагулкі па Дняпру, паездкі ў інтэрнацыянальны лагер «Дружба». На фестывалі, які праводзіўся ў зводным атрадзе, мы былі лепшымі. Нашай агітбрыгадзе не было роўных. І кухары нашы, аказваецца, гатуюць лепш за ўсіх, і медыкі — самыя ўважлівыя і разумныя. Байцы атрада пабывалі на экскурсіі ў Кішынёве і Адэсе. А колькі вітамінаў атрымаў наш арганізм! І сонца ў Малдавіі цудоўнае!

Хутка, зусім хутка «Пунсовыя ветразі» накіруюцца ў дарогу. Хай жывуць весела і дружна, але і не забываюць, што галоўная задача кожнага будатрадаўца — працаваць па-ударнаму.

І. БАШЛЫКЕВЕЦ,
камандзір атрада.

*прашу слова*

## Усё для студэнта

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ журналістыкі запланаваны шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на арганізацыю самастойнай работы студэнтаў. Адно з іх — павелічэнне часу работы кабінетаў і кафедраў факультэта ў перыяд экзаменацыйнай сесіі да 19 гадзін. Студэнты атрымалі магчымасць займацца з вучэбнай, навуковай і метадычнай літаратурай, асобныя найменаванні якой даўно не перавыдаваліся і захаваліся толькі ў нас ці ў цэнтральных бібліятэках горада, куды студэнты малодшых курсаў яшчэ не дапускаюцца. У адпаведнасці з вучэбнымі курсамі былі падабраны неабходная літаратура і дапаможнікі.

Дастаткова складаная праблема — камплектацыя бібліятэчак кафедр неабходнай вучэбнай, метадычнай і навуковай літаратурай. Недастаткова у нас вучэбных дапаможнікаў, хрэстаматый, дакументальнай, мемуарнай літаратуры. Мэтазгодней было б стварыць на факультэце адзіную бібліятэчку. Колькі б адразу вырашалася праблем!

Студэнты з адабрэннем успрынялі рашэнне аб прадоўжанні работы кафедр у перыяд сесіі да 10 гадзін у дзень. Выказваюцца меркаванні, што такі рэжым трэба захаваць і на працягу ўсяго навучальнага года. Але пакуль гэта цяжка, бо ўзнікае кадравая праблема: павелічэнне штату лабарантаў.

Нам трэба накіраваць усе свае сілы на стварэнне найлепшых умоў для самастойнай працы студэнтаў, каб не было нездавальняючых адказаў і ацэнак, слёз і папрокаў у адрас выкладчыкаў.

Н. ГУЛЕЙЧЫК,
майстар вытворчага навучання
факультэта журналістыкі.

*сардэчна віншуем!*

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

Аб узнагароджанні
тав. КІСЯЛЕЎСКАГА Л. І.
Ганаровай граматай Вярхоўнага
Савета Беларускай ССР

За поспехі ў развіцці навукі і тэхнікі, падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна акадэміка Акадэміі навук Беларускай ССР КІСЯЛЕЎСКАГА Леаніда Іванавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Г. ТАРАЗЕВІЧ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. СЫРАЕГІНА.

10 красавіка 1987 года
г. Мінск.

*рэдакцыі адказваюць*

## «Дзяжурны абавязаны...»

ДЫРЭКЦЫЯЙ студгарадка абмеркавана публікацыя «Дзяжурны абавязаны...» (яна была змешчана ў № 10 ад 19 сакавіка 1987 года),— адказвае нам дырэктар Я. М. Шабановіч.— Па сутнасці пытанняў, узнятых у фельетоне, паведамляем, што «Інструкцыя дзяжурнаму па паверху інтэрната...» зацверджана прарэктарам па АХЧ.

Інструкцыя складалася на аснове «Правілаў унутранага распарадку інтэрнацыянальных інтэрнатаў», зацверджаных рэктарам 19 ліпеня 1983 года,і «Правілаў унутранага распарадку...», зацверджаных рэктарам у 1980 годзе.

У прыватнасці, у «Правілах унутранага распарадку...» у § 17 указваецца, што дзяжурства праводзіцца кругласутачна і дзяжурныя вызваляюцца ад заняткаў, і што графік дзяжурства падпісваецца дэканам. У «Правілах унутранага распарадку інтэрнацыянальных інтэрнатаў...» у § 5 указана, што студэнты абавязаны ўдзельнічаць ва ўсіх відах работ, звязаных з самаабслугоўваннем, адпаведна з графікам. Там жа агаворваецца, што вынас маёмасці, асобных рэчаў дазваляецца толькі з дазволу дырэкцыі студгарадка.

У цяперашні час падрыхтаваны новы загад. Пасля зацвярджэння рэктарам «Інструкцыя дзяжурнаму па паверху інтэрната...» будзе прыведзена ў адпаведнасць з новымі «Правіламі ўнутранага распарадку...».

## *успаміны пра лета*

# Экспедыцыя за песняй

**«ЖЫЎ-БЫЎ ПАН. І БЫЛА Ў ЯГО ЛЮБІМАЯ ДАЧКА АЛЕСЯ. ПЕРАД СМЕРЦЮ ПАДАРЫЎ ЕН ЕЙ ВЕСКУ, ЯКАЯ З ТАГО ЧАСУ ТАК І ЗАВЕЦЦА — АЛЕСІНА», — ГАВОРЫЦЦА Ў НАРОДНЫМ ПАДАННІ.**

СЮДЫ, У СМАЛЯВІЦКІ раён Мінскай вобласці, прыехалі летась студэнты-першакурснікі беларускага аддзялення філфака на сваю фальклорную практыку. Сустрэча з невялікай вёскай, якая патанула ў зеляніне садоў, акружана лесам, заўсёды тоіць у сабе нешта хвалюючае. Якія тут людзі! Як беражна захоўваюць яны гісторыю свайго народа! Спачатку студэнтам не верылася, што ў Мінскай вобласці у непасрэднай блізкасці ад сталіцы, можна знайсці такое багацце беларускага фальклору. А аказалася, можна! І пра гэта красамоўна гавораць дзённікі саміх студэнтаў.

З Зояй Прэсняковай і Верай Астрэйка, студэнткамі цяпер ужо II курса, я сустрэлася нядаўна. У Смалявіцкім раёне ім удалося сабраць шмат яркіх валачобных песень, купальскіх, сямейна-абрадавых, жніўных. А што значыць сабраць? З магнітафонам у руках — ад хаты да хаты, з адной вёскі ў другую. Але, ступіўшы на парог, так прама не скажаш: «Спейце мне песню». Трэба было знайсці агульную мову з незнаёмымі людзьмі, выклікаць прыхільнасць чалавека, каб ён адкрыў перад табой душу. Веры і Зоі гэта ўдалося. Экспедыцыя стала для іх вялікай жыццёвай школай.

— Вялікае дзякуй хочацца сказаць тым,— гаворыць Зоя Прэснякова,— хто не адмаўляўся, дапамагаў нам. У кожнай вёсцы ёсць свае вядомыя выканаўцы. Мне ўспамінаецца Галіна Вікенцьеўна Толкач, жыхарка вёскі Алесіна.

У двух кіламетрах ад вёскі Алесіна — вёска Верхмень. Самая звычайная беларуская вёска. Доўгая ціхая вуліца. Хаты па баках. Зноў сустрэчы з людзьмі, міжвольнае дачыненне да іх лёсаў. А лёсы — розныя. Анастасія Адамаўна Казімірчык ціхім роўным голасам выконвае раманс «Плачет девица, горем убитая...».

А што за плячыма гэтай жанчыны? У 27 гадоў — удава. Вайна не абышла бокам і яе дом. Муж быў партызанам, загінуў. Сама засталася цудам жывая, ратуючыся ад немцаў з маленькім дзіцем на руках...

Лёсы чалавечыя, лёсы народа, яго гора і радасць, слёзы і шчасце застаюцца ў песнях, легендах, паданнях.

За час практыкі студэнты прайшлі па слядах Якуба Коласа, які ў 1906 годзе працаваў у вёсцы Верхмень настаўнікам. Цяпер ў Верхменскай школе — музей беларускага песняра. Тут сабраны кнігі, але самае цікавае ўяўляюць сабой успаміны сведкаў аб сустрэчах з Коласам. Студэнты даведаліся пра тое, што самай любімай песняй Коласа была «Туман ярам, туман ярам, туман далінаю...» Жыхары вёскі спяваюць яе і цяпер...

Прыкметы, песні, казкі, паданні... Шырокая і шматгранная вусная народная творчасць. І таму галоўным рэзультатам экспедыцыі была сустрэча студэнцкай моладзі з таленавітымі носьбітамі паэзіі народа.

Таццяна Скакун, студэнтка II курса рускага аддзялення філфака, праходзіла практыку ў сваёй роднай вёсцы Суша Лепельскага раёна, што на Віцебшчыне. Уражанняў так шмат, што словамі не перадаць. Першае, што ўзрушыла Таццяну, гэта багацце роднага кутка на сапраўдныя самабытныя таленты. Раней, захапляючыся народнымі песнямі, якія гучалі па радыё, яна і не здагадвалася, што яе землякі могуць пець гэтак жа цудоўна.

Запісала Таня і каляндарны абрад жаніцьбы «Цярэшкі». Абрад гэты так і іскрыцца вяселлем, народным аптымізмам, жартам — сапраўднае свята!

Экспедыцыя лета-1986 засталася ў мінулым. Студэнты апрацоўваюць і аналізуюць сабраны матэрыял. Ужо напісаны даклады, з якімі паспяхова выступаюць на навуковых студэнцкіх канферэнцыях. Матэрыялы летняй практыкі стануць курсавымі і дыпломнымі работамі. А ў навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору рыхтуюць летнія студэнцкія запісы для выдання зборнікам.

**Н. ВОЙЦІК,**
студэнтка факультэта журналістыкі.

## *мацаваць традыцыі*

# СУСТРЭЧА з Васілём Быкавым

НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ факультэце завяршыўся тыдзень кафедры беларускай літаратуры



рэформы вышэйшай і сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, адносін да помнікаў нацыянальнай гісторыі і культуры.



(гл. пра гэта «Беларускі універсітэт», 1987, №№ 11, 13). І завяршыўся выдатным акордам — сустрэчай з народным пісьменнікам БССР, Героем Сацыялістычнай Працы, лаўрэатам Ленінскай прэміі і Дзяржаўнай прэміі СССР Васілём Уладзіміравічам Быкавым. Амаль дзве гадзіны Васіль Быкаў сам-насам вёў адкрыты, зацікаўлены дыялог са студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта па пытаннях развіцця сучаснай беларускай літаратуры і беларускай мовы, рэформы вышэйшай і сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, адносін да помнікаў нацыянальнай гісторыі і культуры. Аўтар «Знака бяды» заклікаў студэнтаў актыўней уключыцца ў распачатую партыяй барацьбу з негатыўнымі з'явамі нашага жыцця, за дэмакратызацыю, галоснасць, інтэнсіфікацыю працы, адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

Звяртаючыся да студэнтаў нашага універсітэта, пісьменнік запісаў у кнізе ганаровых гасцей: **«Пасланцам беларускай будучыні, студэнтам БДУ, жадаю спраўдзіць спадзяванні народа, які заслужыў у стагоддзях, каб жыць і развівацца поруч з народамі-братамі, нароўні з усімі ў Еўропе.**

**10 красавіка 1987 г. Васіль Быкаў».**

**В. КАЧАНОВІЧ.**
**Фота Г. ЮРЧАНКІ.**



## *быт ці не быт?*

# «Вячэрнія дзядзькі» і іншыя дробязі

**ПОСПЕХУ ПЕРАБУДОВЫ РАБОТЫ Ў ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ МОЖНА ДАМАГЧЫСЯ ТОЛЬКІ ПРЫ СВЯДОМЫМ УДЗЕЛЕ Ў ЕЙ САМІХ СТУДЭНТАЎ, ІХ ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ АДНОСІНАХ ДА ВУЧОБЫ, ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ.**

**ДАВАЙЦЕ Ж ПАГЛЯДЗІМ, НАВОШТА ПАТРЭБЕН СТУДЭНТУ ІНТЭРНАТ? ГЭТА НЕ ТОЛЬКІ ДАХ НАД ГАЛАВОЙ І ЦЁПЛАЯ ПАСЦЕЛЬ. ГЭТА СВОЙ ДОМ, ДЗЕ МОЖНА СМАЧНА ПАЕСЦІ, ДОБРА АДПАЧЫЦЬ ПАСЛЯ НАПРУЖАНАГА ДНЯ ВУЧОБЫ, ПАСЛУХАЦЬ МУЗЫКУ, ПАТАНЦАВАЦЬ.**

МНОГАЕ РОБІЦЦА ў інтэрнаце № 4 дзеля арганізацыі выхаваўчай работы, адпачынку студэнтаў і паляпшэння бытавых умоў іх жыцця. У мінулым годзе ў інтэрнаце было арганізавана шмат сустрэч з цікавымі людзьмі. Вялікую аўдыторыю сабралі сустрэчы з прафесарам Іосіфам Аляксандравічам Юхо. Яго гутаркі заўсёды цікавыя, яны вучаць слухачоў любіць і паважаць гісторыю і культуру роднай Беларусі. Засталася ў памяці сустрэча з чэмпіёнамі свету, Еўропы, Гульняў добрай волі.

І, вядома, больш за ўсё падабаецца студэнтам дыскатэка.

Умудроныя жыццёвым вопытам і асабліва службовым становішчам людзі чамусьці лічаць дыскатэку нікчэмнай справай, пустым баўленнем часу, «танцулькамі» і ўсяляк перашкаджаюць яе правядзенню.

Не стану заводзіць з імі доўгія спрэчкі, толькі адзначу, што дыскатэка — справа сур'ёзная. «Самы лепшы адпачынак — гэта танцы»,— сцвярджаюць сацыёлагі. Не толькі месцам адпачынку павінна быць дыскатэка, але і месцам эстэтычнага выхавання, дзе можна даведацца аб новым у сучасных маладзёжных плынях, аб сучасных кампазітарах, аб музыцы наогул. Сюды можна запрашаць музыказнаўцаў, кампазітараў, спевакоў — неабавязкова славутых, а, скажам, студэнта вакальнага факультэта кансерваторыі. Хіба ж гэта нецікава?

Руплівыя адміністратары студгарадка, патрабуючы заканчваць дыскатэку ў 23 гадзіны, спасылаюцца пры гэтым на пастанову Мінгарсавета, што забараняе шумныя мерапрыемствы пасля 23 гадзін. Але ж гэта чыстай вады бюракратызм! І вось чаму. Танцы ў інтэрнаце № 4 праводзяцца ў падвальным памяшканні, а вакол — ніводнага жылога дома. Таму, мяркую, гэтае абмежаванне можна адмяніць.

Чаму б не паспрабаваць праводзіць ў інтэрнаце вечар адпачынку? У адну суботу яго арганізоўвае адзін паверх, у другую — другі, або імяніны з тортам і гарбатай, на якія запрашаюцца жыхары ўсяго паверха... Форм калектыўнага адпачынку шмат,і выдумваць тут нешта асаблівае не трэба. Варта толькі пазбавіцца ад руціны абыякавасці да свайго лёсу і лёсу сваіх сяброў.

Доўгі час ужо мараць жыхары інтэрната аб занятках спортам. Перагледзеўшы ўсе спартыўныя адзінкі — 4 пары лыж і 10 пар канькоў,— прыходзім да сумнага выніку. І ўсё ж студэнты неяк умудраюцца без спартыўнай залы і інвентару займаць першае месца ў спартакіядзе паміж інтэрнатамі універсітэта, другое — у спаборніцтвах па валейболу, тэнісу, шашках. Існуе і клуб аматараў спорту.

Можа кагосьці і задавальняе такое становішча спраў, толькі няўрымслівыя студэнты ўжо адшукалі памяшканне, дзе ёсць магчымасць усталяваць спартыўныя прылады. Далёка ісці не давялося: пакоі знайшліся ў... падвале інтэрната. Але ж патрэбны яшчэ і будаўнічыя матэрыялы, а гаспадарчыя службы універсітэта на ўсе гэтыя праблемы пазіраюць пакуль што без цікавасці.

Хаця гэта і не дзіўна, бо не звяртаюць яны належнай увагі і на больш складаныя пытанні. Як вядома, інтэрнат № 4 быў здадзены ў эксплуатацыю ў 1959 годзе. За мінулыя гады будынак састарыўся, пачалі цячы трубы, абвальваецца тынкоўка. Вось ужо год ідзе тут рамонт. Адрамантаваны 4 паверхі, пакоі, санвузлы, але ў ранейшым стане знаходзяцца лесвічныя клеткі, чытальная зала, ленінскі пакой. А пра тое, калі работнікі БДУ возьмуцца за рамонт падвальных памяшканняў, яшчэ і гаворкі не вялося. І іх зразумець можна: у РБУ свае праблемы.

Інтэрнат усё болей пераходзіць на самаабслугоўванне. Створана рамонтная брыгада, якая адрамантавала 50 сталоў, болей 200 крэслаў, а зараз выпраўляе недаробкі, пакінутыя будаўнікамі РБУ.

Аб пашырэнні студэнцкай ініцыятывы і зацікаўленасці марым зараз мы ўсе: ад выкладчыка да міністра. Чаго не хапае інтэрнату № 4, дык гэта поўнага самакіравання. Яно пакуль што немагчыма, бо, як гавораць, у сямі нянек дзіця без вока. А вось калі ў інтэрнаце будуць жыць толькі студэнты юрыдычнага факультэта — будзе адзін гаспадар, павысіцца зацікаўленасць і адказнасць. Да таго ж, у будучым годзе павялічыцца прыём студэнтаў на першы курс юрыдычнага факультэта. Што датычыць студэнцкага савета і камітэта камсамола, то яны да самакіравання ўжо падрыхтаваліся.

«Вячэрнія дзядзькі», якімі сталі дзяжурныя выкладчыкі, зарэгуляванасць шматлікімі правіламі і інструкцыямі — вось чым вызначаюцца зараз амаль усе інтэрнаты універсітэта. А час патрабуе пазбаўляцца ад усіх недахопаў. І чым хутчэй, тым лепей.

**У. ЛАГОЙСКІ,**
выкладчык юрыдычнага факультэта, адказны за работу ў інтэрнаце № 4.

## *газета выступіла.*

## *Што зроблена?*

# «ЗА ПРАТАКОЛАМІ НЕ СХАВАЕШСЯ»

**МАТЭРЫЯЛ ПАД ТАКОЙ НАЗВАЙ БЫЎ НАДРУКАВАНЫ Ў № 34 АД 18 СНЕЖНЯ 1986 ГОДА. ГАВОРКА Ў ІМ ІШЛА ПРА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧУЮ ПАСТАНОЎКУ РАБОТЫ СТУДЭНЦКАГА НАВУКОВАГА ТАВАРЫСТВА ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.**
**РЭДАКЦЫЯ АТРЫМАЛА АДКАЗ ЗА ПОДПІСАМ В. ЛАМАКІ, САКРАТАРА ПАРТБЮРО ХІМФАКА, І А. ВЕЧАРА, АДКАЗНАГА ЗА НДРС ФАКУЛЬТЭТА:**

«Стан студэнцкай навуковой работы пастаянна знаходзіцца ў сферы ўвагі дэканата і партыйнай арганізацыі хімічнага факультэта.

Нас даўно хвалююць тыя абставіны, што, нягледзячы на ўсе намаганні, доля студэнтаў I—III курсаў, якія актыўна працуюць, застаецца адной і той жа, хоць па знешніх прыкметах (колькасць дакладаў на штогадовай навуковай канферэнцыі БДУ, высокія адзнакі за студэнцкія навуковыя работы на рэспубліканскім і Усесаюзным турах агляду-конкурсу), стан студэнцкай навуковай работы цалкам здавальняючы.

Як вядома, загад міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР № 660 нацэльвае нас на арганізацыю самастойнай творчай працы студэнтаў. Зразумела, лепшы шлях да самастойнасці — навуковая праца.

Нельга забывацца і на такія, напрыклад, абставіны. Дзейнічае «Палажэнне аб навукова-даследчай рабоце студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў». У ім указваецца, што «студэнты... могуць аб'ядноўвацца ў студэнцкае навуковае таварыства». Але да сённяшняга часу (год зацвярджэння палажэння — 1974) няма палажэння пра СНТ, цяжкавата прыходзіцца з камандзіраваннем студэнтаў на канферэнцыі ў іншыя ВНУ».

У адказе адзначана, што заўвагам, выказаным у матэрыяле, месца на факультэце болей не будзе.

Не перакананы, што на іншых факультэтах гэтая справа пастаўлена лепей. Таму неабходнасць у матэрыялах газеты, дзе б ставілася і вырашалася гэтае пытанне, на нашу думку, усё ўзрастае. А праблем тут шмат. Ні для каго не сакрэт, што поспехі студэнтаў у навукова-даследчай рабоце амаль не ўлічваюцца пры размеркаванні. Неаднойчы даводзілася нам сутыкнуцца з тымі абставінамі, што нават выдатнікі, калі яны не маюць мінскай прапіскі, не могуць працаваць пасля заканчэння універсітэта там, дзе прынеслі б найбольшую карысць грамадству.

Часта паўстае і такое пытанне: «Калі ж займацца навуковай працай?» І сапраўды, дзе знайсці час студэнтам, асабліва малодшых курсаў, калі заняткі ў іх заканчваюцца каля 16 гадзін, а навуковыя супрацоўнікі лабараторый НДІ ФХП у гэты час ужо заканчваюць работу?

Непакоіць нас і такое пытанне, як заахвочванне студэнтаў.

Партыйная арганізацыя хімічнага факультэта прыме ўсе меры па давядзенню рашэнняў савета факультэта і партыйнай арганізацыі, закранаючых пытанні студэнцкай навукова-даследчай работы, да студэнцкай грамадскасці. Спадзяёмся, што навуковая работа, як і вучэбная, будзе атрымліваць больш увагі з боку камсамольскай арганізацыі студэнтаў хімічнага факультэта».

# УВАСАБЛЕННЕ ІДЭІ

## Аб тым, як на практыцы рэалізуецца прынцып «даверылі — дзейнічай»

лаўрэаты прэміі Ленінскага Камсамола Беларусі

— ЗАХОДЗЬЦЕ,— Паляшчук адчыняе дзверы.

Крок — і адразу трапляеш у паўзмрок вузенькага праходу, зверху данізу застаўленага кардоннымі скрынямі і самай living апаратурай. Пасля шырокага і доўгага універсітэцкага калідора лабараторыя здаецца цеснай і няўтульнай.

Іменна тут разгараюцца бескампрамісныя спрэчкі, нараджаюцца ідэі маладых вучоных. Вось сказала «вучоных» і быццам ужо чую пытанне Сашы Каваленкі, аспіранта кафедры:

— Скажыце, а мэнээс — гэта вучоны?

— Я таксама не лічу сябе вучоным,— зазначыць старшы навуковы супрацоўнік Ігар Паляшчук.— Хутчэй за ўсё мы — інжынеры-даследчыкі.

### ПРЫНЦЫП КЛЮЧНІКАВА

ЧАМУ прафесар Ключнікаў перайшоў на ФПМ (факультэт прыкладной матэматыкі БДУ.— Н. Н.), тлумачаць па-рознаму. Зрэшты, гэта і няважна. Галоўнае — іменна з яго прыходам сюды звязваюць ва універсітэце з'яўленне па сутнасці новай кафедры інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцей, а карацей — інфарматыкі.

Калектыў кафедры стаў на ногі хутка. Сюды разам з прафесарам перайшлі Ігар Паляшчук і Валодзя Лабуда. Пад апекай Ключнікава «раслі» хлопцы як спецыялісты і дыпломныя работы пісалі пад яго кіраўніцтвам.

— У жніўні гэта было,— успамінае выпускнік ФПМ Саша Каваленка.— Сяджу, чытаю разумныя кнігі. Шэф адзін раз прайшоў, а на другі спыніўся і гаворыць: маўляў, хопіць займацца глупствам, трэба аб сур'ёзным думаць. І я задумаўся...

Усе смяюцца.

Пазней пачаў працаваць тут і Валодзеў аднакурснік Саша Гопка.

— Напачатку былі ў нас «тупікі»,— прызнаецца Ігар.— Мы да чаго прывыклі? Даюць заданне і тут жа спіс рэкамендацый, як яго выканаць лепш. Ключнікаў ад гэтага адразу адмовіўся. Ён і цяпер прытрымліваецца прынцыпу: даверылі — дзейнічай. Для яго проста адсутнічае паняццце «не ведаю».

Безумоўна, можна не згаджацца з метадамі работы кіраўніка. Але не заўважыць у іх асаблівы тактычны ход немагчыма. Кожнае заданне прафесара прымушае не проста перагарнуць старонкі спецыяльнай літаратуры, а перш-наперш думаць. Потым ужо — ставіць эксперыменты і разам шукаць адказы.

— У нас усе і ўсё навідавоку,— Саша Гопка пастуквае алоўкам па стале.— Ні «тайн», ні перашэптванняў — нічога падобнага няма. Чаму загаварыў аб гэтым? Кафедра — не першы працоўны калектыў у маім жыцці. Я добра ведаю, што такое недагаворкі на рабоце. Скажам, вырашыў Паляшчук напісаць артыкул у навуковы часопіс. Адразу ж пачуеце: «Хлопцы, хто жадае дапамагчы?» Ці едзе Каваленка або хто-небудзь іншы ў камандзіроўку на канферэнцыю, я магу быць спакойным: калі вернецца, аб усім, што прагучыць там па маёй тэме, абавязкова даведаюся.



Плён такой работы відавочны. І ў плане станаўлення маладых даследчыкаў, і ў чалавечым. Дружба, што нарадзілася ў студэнцкія гады, «сталее».

Дарэчы, шэф для сваіх падначаленых — выдатны прыклад для пераймання. Мяркуйце самі. У 25 А. С. Ключнікаў абараніў дысертацыю. Цяпер яму 41 год. Ён — прафесар, доктар тэхнічных навук, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, загадчык кафедры інфарматыкі, дырэктар вылічальнага цэнтра Белдзяржуніверсітэта. Унушальна?

— Працаваць з ім лёгка і цікава,— сцвярджаюць на кафедры.— Ключнікаў з тых людзей, хто не толькі чуйна рэагуе на «свежы вецер» у навуковым паветры, а часам нават сам робіць прагнозы.

З шэфам, па ўсім відаць, маладым даследчыкам пашанцавала. А яму з імі?

### А ТАКСАМА — ВЫПАДАК?

— У ЖЫЦЦІ больш выпадковага, чым запланаванага,— разважае Валодзя Лабуда.— Хіба марыў хто з нас аб Навуцы?

— У школе, вядома, не,— падтрымаў яго Ігар.— Чалавека, калі можна так сказаць, фарміруюць асяроддзе і абставіны. Лічу, што цікаўнасць здольна ўзнікнуць і на голым месцы. Толькі першапачаткова патрэбен штуршок.

Гэта Ігар пра сябе. Аднойчы «захварэўшы» радыёфізікай, ён не супакоіўся, пакуль не ўладкаваўся працаваць на ФРФ лабарантам, дзе вучыўся ў той час на вячэрнім аддзяленні.

Лёсы Аляксандраў — Гопкі і Каваленкі — на дзіва падобныя. Абодва марылі стаць кадравымі афіцэрамі. Абодва паступалі ў вышэйшыя ваенныя вучылішчы. Але падвёў зрок.

— Яшчэ я спрабаваў стаць студэнтам універсітэта Дружбы народаў, што ў Маскве, і — зноў няўдача,— расказвае Саша Гопка.— Вяртаючыся дадому, у Вільнюс, спыніўся ў сваіх знаёмых у Мінску. Далей усё было зусім выпадковым. Праходзіў непадалёк універсітэта, убачыў аб'яву аб прыёме.

І, дадам, не без ваганняў выбраў радыёфізіку. Палічыў яе больш сур'ёзнай за геаграфію, якой цікавіцца і цяпер.

— А вось Валодзю Лабуду, як кажуць, сам лёс загадаў грунтоўна заняцца радыёфізікай,— жартуюць хлопцы.— Бацька яго — загадчык кафедры ФРФ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, брат Сяргей — фізік, таксама мае вучоную ступень, лаўрэат прэміі камсамола Міншчыны.

Словам, Валодзя ў навуцы — чалавек не выпадковы.

Спраў у кожнага заўсёды безліч. Валодзя з Ігарам ужо скончылі аспірантуру: Каваленка — пакуль яшчэ аспірант. Саша Гопка працуе над сваёй навуковай работай.

— Калі вучыўся на ФРФ, займаўся ў студэнцкім навуковым таварыстве,— гаворыць ён.— Але, мабыць, толькі цяпер зразумеў, як шмат часу страчана дарэмна. Пачынаць сур'ёзную работу над сабой трэба было раней.

Але папракаць сябе ў нечым у Сашы, здаецца, няма падстаў. Студэнтам ён выконваў работы па гаспадарчых дагаворах. Прычым...

— Не згаджаўся з тым, што мне прапаноўвалі,— зазначае ён.— Мне заўсёды хацелася атрымаць хоць «кавалачак», але нейкай НОВАЙ работы. Выканаць яго і ўбачыць СВОЙ вынік.

Гопка не любіць абязлічання ні ў чым. І калі займаецца справай, то такой, якая пасля завяршэння «знойдзе прапіску» не на пыльных паліцах архіваў.

Некаторыя яго не разумеюць: трэба ж, гавораць, памяняў у аспірантуры трох навуковых кіраўнікоў. Адпаведна мяняліся і тэмы даследаванняў. Але не будзем спяшацца з вывадамі. Тут, відаць, дарэчы будзе ўспомніць словы Валянціна Пікуля на нядаўняй сустрэчы з тэлегледачамі: «...няшчасных людзей было б значна менш, калі б яны знайшлі сваю справу».

Выходзіць, Ключнікаву з падначаленымі таксама пашанцавала.

### І, НАРЭШЦЕ, ІХ СПРАВА

КАЛІ былі ўзважаны ўсе «за» і «супраць», Паляшчук прыйшоў да шэфа з прапановай — стварыць на кафедры КТМК. Чаго чакалі маладыя даследчыкі ад будучага фарміравання?

— Іменна КТМК дае магчымасць паставіць задачу і паслядоўна вырашаць яе,— адказа кіраўнік творчага маладзёжнага калектыву Ігар Паляшчук. — Мы не варымся ва ўласным саку, а пастаянна атрымліваем дапамогу, у тым ліку і кансультацыйную ад спецыялістаў і вучоных універсітэта. Што, дарэчы, і абумоўлена дагаворам аб КТМК.

Акрамя знаёмых нам хлопцаў, у КТМК увайшлі інжынеры Ларыса Дайнека і Наталля Шкут, а таксама аспірант кафедры Алег Канавалаў.

Тэма, якой займаецца КТМК, — «Распрацоўка метадаў і сродкаў аўтаматызацыі працэсу праектавання электрадынамічных сістэм». Кола вывучаемых пытанняў дастаткова шырокае.

Адно з іх — праблема электрамагнітнай сумяшчальнасці. Каб зразумець, што гэта такое, прыгадайце... колькі разоў вы «праклінал» суседа, калі той «несвоечасова» ўключаў электрабрытву. Толькі яна пачынала працаваць, як на экране тэлевізара з'яўляліся рабыя палоскі.

Аднак гэта — толькі маленькая частка сур'ёзнай работы маладых даследчыкаў па стварэнню сістэмы аўтаматызаванага праектавання (САПР) электрадынамічных устройстваў.

Варта адзначыць, што ў САПР закладваецца інфармацыя, якая абагульняе вопыт распрацовак у пэўнай галіне ведаў. Літаратура дае нам нямала прыкладаў эфектыўнасці гэтых сістэм. Паводле даных замежнага друку, у выніку выкарыстання САПР тэрміны праектавання і даводкі самалётаў скарачаюцца ў 2—3 разы, а на стварэнне новай мадэлі аўтамабіля замест 2—3 гадоў ідзе толькі 8—12 месяцаў.

— Справа, за якую мы ўзяліся, новая,— тлумачыць Каваленка,— таму праблем і складанасцей пакуль больш чым дастаткова.

Калектыў хоча дабіцца таго, каб ствараемая САПР узяла на сябе рашэнне задач тэхнічнага характару: вядзенне дакументацыі, ацэначныя разлікі, графічнае адлюстраванне інфармацыі і г. д. Гэта з аднаго боку. З другога — каб сістэма мела магчымасць расшырэння — пастаяннага папаўнення базы ведаў і метадаў. І абавязкова была даступнай і зручнай праекціроўшчыкам, якіх менш за ўсё цікавіць сама будова САПР; для іх важны вынік.

— Для нас таксама,— гаворыць Каваленка,— але..,— ён не заканчвае сваю думку. Пэўна, не хоча забягаць наперад. Магчыма, гэта і правільна: да мэты ж яшчэ так далёка...

* *
*

РАБОЧЫ дзень скончыўся.

— Давайце па кубку чаю і — дадому,— Ігар ужо нясе вялікія конаўкі. На стале аднекуль з'яўляецца слоік варэння.

П'ём чай з такім смачным на галодны страўнік хлебам. Глядзім слайды, аўтары якіх Саша Каваленка і Валодзя Лабуда. Кадр за кадрам — і дзякуючы дасціпным каментарыям маіх субяседнікаў убачанае ажывае. Вось хлопцы са сваімі сем'ямі на Нарачы, Валодзя і Саша Гопка будуюць дарогу ў Сібіры, Ігар з Ключнікавым у Тбілісі, а гэта...

— Ніколі не адгадаеце,— сцвярджае Каваленка і адразу тлумачыць:— вечар грузінскай кухні. Каб трапіць на яго, трэба было самому прыгатаваць нацыянальную грузінскую страву.

Апошні слайд.

...Крок — і я зноў у вузкім праходзе, што злучае кабінеты «шэфа» і «падначаленых». Быццам нічога тут не змянілася, але мне чамусьці падабаецца ўжо і гэта цесная лабараторыя, і скрыні на падаконніках, дзе на тонкіх сцяблінках перцу палымнеюць чырвоныя стручкі.

Чаму?..

Н. НЕВІДОМАЯ.

# Пра самага Чалавечнага ЧАЛАВЕКА

П. І. ТКАЧОЎ

**Павел Іванавіч Ткачоў не толькі загадчык кафедры класічнай рускай літаратуры філалагічнага факультэта. Акрамя навуковай, выкладчыцкай дзейнасці ён піша кнігі для дзяцей і юнацтва. Кнігі Паўла Іванавіча пра самага дарагога і блізкага нам чалавека — Уладзіміра Ільіча Леніна.**

**Ленінская тэма стала для пісьменніка галоўнай. Першае апавяданне было надрукавана ў 1957 годзе. З таго часу выйшла каля 20 зборнікаў апавяданняў і аповесцей пра У. І. Леніна на беларускай, рускай, украінскай, армянскай, малдаўскай, іспанскай, арабскай і іншых мовах. У хуткім часе выйдзе кніга «Маніфест народнага шчасця. Расказ аб Праграме КПСС», для часопісаў «Бярозка» і «Полымя» перададзены аповесці, дзе пісьменнік зноў звяртаецца да вобраза Ільіча. Працягвае П. І. Ткачоў працу над двухтомнікам выбраных твораў.**

**Напярэдадні дня нараджэння У. І. Леніна пісьменнік расказвае пра тое, як нараджаюцца творы аб Ільічу.**

ПАЧАЛОСЯ ўсё са звычайнай камандзіроўкі. Вось напісаў я словы «са звычайнай камандзіроўкі» і задумаўся: звычайная ці незвычайная, выпадковая ці невыпадковая камандзіроўка? Відаць, не зусім дакладна — да яе, той камандзіроўкі, я ішоў усё свядомае жыццё... Ды і ўвогуле ці адыграла тут нейкую ролю камандзіроўка? Хутчэй за ўсё яна з'явілася непасрэдным штуршком, імпульсам...

Аднойчы (гэта было ў 1957 годзе: у той час я працаваў у газеце «Зорька») мяне паклікала рэдактар Н. Ф. Мазурава і сказала, што неабходна з'ездзіць у Магілёў, сустрэцца з рабочым Аляксандрам Пятровічам Пархімчыкам і расказаць пра яго працоўныя перамогі ў наступным нумары газеты.

З Аляксандрам Пятровічам мы сустрэліся на заводзе, дзе ён працаваў токарам, але пагутарыць не змаглі — ён выконваў тэрміновае (і вельмі складанае!) заданне. Дамовіліся, што пасля змены я падыйду да прахадной завода, і мы разам пойдзем да яго на кватэру.

— Там і пагаворым,— сказаў ён.

...Дома нас сустрэў унук Аляксандра Пятровіча Міколка, гадоў 11—12 хлапчук. Не паспелі мы ўвайсці ў пакой, як Міколка да Аляксандра Пятровіча:

— Дзядуля, ёсць заданне. Тэрміновае.

— Якое-такое заданне? — пытаецца дзед.

— Заметку ў нашу «Чырвоную зорачку» трэба напісаць.

«Чырвоная зорачка», як потым высветлілася,— школьная насценная газета, а Міколка ў ёй за галоўнага рэдактара.

— Заметку?! — здзіўляецца Аляксандр Пятровіч.— Пра што ж пісаць заметку? Пра наш завод?

— Ды не,— гаворыць унук.— Пра сустрэчу з Уладзімірам Ільічом Леніным. Калі ты камунарам быў. Ты ж расказваў мне.

Я нават веры не даў Міколкавым словам — Аляксандр Пятровіч сустракаўся з Леніным?! Побач са мной сядзіць чалавек, які бачыў Леніна! Людзі, якім пашчасціла сустракацца з Уладзімірам Ільічом, слухаць яго выступленні, у маім уяўленні былі незвычайнымі людзьмі, легендарнымі... А тут вось ён, гэты чалавек — сціплы, звычайны, як і ўсе мы — зямны.

— Ну які з мяне пісьменнік, Міколка? Расказаць, калі ласка, раскажу. А каб гэта ўсё выкласці на паперу — выбачай, не змагу.

Давялося мне праявіць журналісцкую салідарнасць і падтрымаць свайго малодшага калегу.

— Вы расказвайце, Аляксандр Пятровіч, а я буду асноўнае памячаць у блакноце. Потым разам прагледзім — вось і будзе заметка для «Чырвонай зорачкі».

— Угаварылі,— нарэшце пагадзіўся Аляксандр Пятровіч...

З таго часу ў маім блакноце засталіся запісы.

Аляксандр Пятровіч Пархімчык (Алеська Пархімчык) жыў у Маскве разам з бабуляй. Бацька на фронце супраць белых ваяваў. А маці восенню памерла. Гаварылі, ад голаду...

Алесь працаваў на заводзе...

...Быў юным камунарам...

...Майскім ранкам дваццаць хлапчукоў, дваццаць юных камунараў крочылі па вуліцы на Красную плошчу... У кожнага ў руках — дрэўца і рыдлёўка.

Дзень выдаўся цёплы. Здавалася, сама прырода радавалася вялікаму рабочаму святу.

Атрад юных камунараў спыніўся ля Крамлёўскай сцяны, дзе была трыбуна. А людзі ішлі і ішлі. Усю плошчу запоўнілі. Навокал — чырвань сцягоў.

І раптам на ўсёй плошчы ад краю да краю ўсталявалася цішыня.

На трыбуну падымаўся чалавек...

— Ленін! Ленін! Ленін! — перадавалі адзін аднаму людзі.

— Няхай жыве таварыш Ленін! — закрычалі камунары.

І плошча грымнула:

— Няхай... жыве... таварыш Ленін!

Уладзімір Ільіч прыветліва памахаў камунарам кепкаю.

І вось Ленін пачаў гаварыць.

Алеська глядзеў на правадыра, падняўшыся на дыбачкі, стараўся запомніць яго твар, кожнае слова.

Ленін скончыў прамову і сышоў з трыбуны. Тут яго абступілі камунары. Нехта падаў Уладзіміру Ільічу маладзенькую ліпку, Алеська — рыдлёўку. Ленін паглядзеў на хлопцаў, усміхнуўся і сказаў:

— А вы — сапраўдныя гаспадары. Гэта вельмі добра. Дзеці рабочых павінны памагаць рэвалюцыі.

Уладзімір Ільіч асцярожна паставіў дрэўца ў ямку і гэтак жа асцярожна засыпаў карэньчыкі зямлёю.

І нібы працягваючы размову, Ленін загаварыў пра цудоўную будучыню:

— Мы, магчыма, не ўбачым гэтай будучыні, сябры. Але цвёрда веру, яе ўбачаць нашы дзеці...

Так нарадзілася першае апавяданне пра У. І. Леніна — «Заметка».

...На маім пісьмовым стале, пад шклом ляжыць здымак: У. І. Ленін, вакол дарослыя, а побач з Ільічом хлопчык — Петрык Мельнікаў. Успамінаю расказ Пятра Мікалаевіча Мельнікава пра самы шчаслівы дзень у яго жыцці — калі восенню 1921 года на Бутырскі хутар, дзе знаходзілася вучэбна-доследная гаспадарка Маскоўскага вышэйшага заатэхнічнага інстытута, прыязджаў на выпрабаванне першага электраплуга Уладзімір Ільіч Ленін...

У той дзень Петрык прачнуўся позна. Паснедаў, абуў вялізныя матчыны боты і выйшаў на ганак. З ганка добра відаць майстэрні. Непадалёку ад іх Петрык убачыў на полі рабочых, якія корпаліся ля плуга. Незвычайны той плуг. Колы вялікія, вялікія. «Колькі ж коней трэба, каб пацягнуць такі плуг?» — падумаў хлопец і, саскочыўшы з ганка, нацянькі пабег да рабочых.

Рабочыя прымацоўвалі лемяшы, змазвалі маслам розныя валікі і шасцерні, прыкручвалі гайкі.

— А дзе вы коней возьмеце? — спытаў Петрык у суседа Васіля.— У гаспадарцы, мабыць, гэтулькі і не знойдзецца, каб пацягнуць такі плуг.

— Коней, кажаш,— Васіль паклаў гаечны ключ у скрынку, узяў анучку, каб выцерці рукі.— Ёсць, братка, і коні. Вось,— Васіль паказаў на два тоўстыя чорныя правады, што ішлі ад плуга да дратоў на слупах.— Дужыя коні. Электрычныя. Зразумеў?

Петрык хацеў адказаць, што нічога ён не зразумеў, але не паспеў: пачулася гудзенне. Па дарозе, што вяла праз поле да Бутырскага хутара, ехаў аўтамабіль.

З дамоў выбеглі людзі.

— Ты, Петрык, давай дамоў бяжы. Няма калі з табой гаварыць. Мы Уладзіміра Ільіча Леніна сустракаем,— сказаў Васіль.

Петрык не паверыў Васілю, але вось машына спынілася, і з яе сапраўды выйшаў Уладзімір Ільіч.

Яго хлопчык адразу пазнаў. Леніна бачыў на партрэтах.

Леніна акружылі рабочыя, жанчыны, студэнты.

«Дадому! — падумаў Петрык.— Хто гэта пойдзе цяпер дадому!» І таксама пачаў праціскацца да Леніна.

Убачыў яго Уладзімір Ільіч, нахіліўся і падняў на рукі.

У Петрыка ажно дух заняло.

— Як завуць цябе? — спытаў Ленін.

— Пе-пе-трык,— ледзь вымавіў ён.

— Бацькі твае тут працуюць?

— Маці даярка. А тата... памёр.

Уладзімір Ільіч апусціў Петрыка на зямлю і паправіў на ім шапку.

Уладзімір Ільіч агледзеў гаспадарку, прысутнічаў пры выпрабаванні электраплуга. Петрык ні на крок не адыходзіў ад Леніна. Таксама глядзеў, слухаў тлумачэнні. Затое ў кароўніку ён сам павёў Леніна.

— Вунь тая чырвоная — Зорка. Праўда, прыгожая?

— Прыгожая,— згадзіўся Уладзімір Ільіч.

— А вунь да той не падыходзьце. Бадаецца. Ёй і рогі за гэта падпілавалі.

Уладзімір Ільіч засмяяўся...

Перад ад'ездам Васіль папрасіў Леніна сфатаграфавацца разам з усімі. Уладзімір Ільіч згадзіўся. Сталі ля плуга. Петрык прытуліўся да Уладзіміра Ільіча... Такім і атрымаўся вядомы здымак: Ленін, вакол дарослыя, а побач з Ільічом — Петрык Мельнікаў.

Расказ Пятра Мікалаевіча Мельнікава (ён зараз на пенсіі, жыве ў Маскве) лёг у аснову апавядання «Шчаслівы дзень Петрыка Мельнікава».

Сустрэчы, сустрэчы, сустрэчы... Іх было вельмі многа, і сустрэчы гэтыя адбываліся не толькі з людзьмі, якія ведалі У. І. Леніна, але і з ленінскімі працамі, дакументамі, з мясцінамі, дзе жыў і працаваў У. І. Ленін.

...У Цэнтральным музеі У. І. Леніна г. Масквы захоўваецца шмат запісак, пастаноў, напісаных ленінскай рукой, у якіх ён, заняты ў той час вялікай дзяржаўнай работай, прасіў дапамагчы аднаму з харчаваннем (уся сям'я галадае), другому з кватэрай (жыве ў сырой, дзеці хвараюць), трэцяму прывезці дроў (у кватэры вельмі холадна, а таварыш толькі што хварэў на запаленне лёгкіх), чацвёртага раіў накіраваць (калі ж будзе адмаўляцца, спасылаючыся, што шмат нявырашаных пытанняў,— прымусіць!) у санаторый або ў вёску «на малако...»

А колькі ленінскіх дакументаў датычыцца непасрэдна дзяцей...

Мяне зацікавіла адна ленінская рэзалюцыя на запісцы яго сакратаркі, і я паспрабаваў расказаць пра гісторыю.

...У канцы чэрвеня 1920 года народны камісар харчавання Аляксандр Дзмітрыевіч Цюрупа пазваніў у прыёмную Уладзіміра Ільіча Леніна і спытаў:

— Уладзімір Ільіч заняты?

— Так,— адказала сакратарка,— у яго Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі.

— Калі вызваліцца Уладзімір Ільіч, спытайце: ці зможа ён сёння ахвяраваць мне пяць хвілін? Я потым пазваню.

— Добра,— сакратарка пазначыла ў сваім рэгістрацыйным сшытку: «Нарком харчавання Цюрупа — 5 хвілін». Потым закрэсліла лічбу «5» і паставіла — «10». Краіна ахоплена страшэнным голадам, пытанні, з якімі звяртаецца нарком харчавання да Леніна, маюць надзённае, важнае значэнне, і, як меркавала сакратарка, вырашыць іх за пяць хвілін немагчыма.

Уладзімір Ільіч прыняў Цюрупу ў другой палове дня.

— Што ў вас новага, Аляксандр Дзмітрыевіч? — спытаў Ленін.

— Прыйшоў за дапамогай, Уладзімір Ільіч,— Цюрупа прысеў на крэсла.

— А што так?

— У Астрахані ёсць шэсць тысяч пудоў чорнай ікры. Таварышы з азербайджанскага саўнаргаса вырашылі за мяжу вывезці, каб там за яе сёе-тое купіць.

Уладзімір Ільіч слухаў моўчкі, потым узяў аловак і пачаў нешта падлічваць.

— Так,— нарэшце прамовіў ён.— Дзевяноста шэсць тысяч кілаграмаў. Мы зможам падтрымаць дзесяткі тысяч дзяцей і хворых.

Ленін узяў аркуш чыстай паперы і накідаў тэкст тэлеграмы.

Тэлеграму адразу ж накіравалі ў Баку і Астрахань.

Прайшло некалькі дзён. Уладзімір Ільіч сказаў сакратарцы:

— Пацікаўцеся ў Аляксандра Дзмітрыевіча аб адказе з Баку на нашу тэлеграму. Я буду на пасяджэнні Савета працы і абароны.

Праз гадзіну Уладзіміру Ільічу перадалі запіску сакратаркі:

«У прыёмнай чакаюць два таварышы, якія прывезлі з Азербайджана, з мандатам ад Нарыманава, у Ваша распараджэнне шэсць вагонаў ікры. Чакаюць Вашых распараджэнняў».

Ленін паглядзеў на гадзіннік: без чвэрці дванаццаць. У дванаццаць пачнецца абмеркаванне мерапрыемстваў па аказанню дапамогі сялянам, і ён павінен быць на пасяджэнні: у яго ёсць шэраг заўваг, дапаўненняў. А вельмі хацелася б сустрэцца, пагаварыць з азербайджанцамі. На вялікі жаль — часу няма. І тут жа на запісцы сакратаркі Уладзімір Ільіч напісаў: «У Камхарчаванне для дзяцей» і тройчы падкрэсліў слова «дзяцей»...

У канцы 50-х гадоў я пачаў падарожнічаць па ленінскіх мясцінах: Ульянаўск, Казань, Какушкіна, Алакаеўка, Куйбышаў (былая Самара), Сызрань, Бястужаўка, Ленінград, Масква, Краснаярск, Шушанскае, Мінусінск, Ермакоўскае, Пскоў, Разліў, Горкі...

Паступова ў выніку сустрэч, падарожжаў па ленінскіх мясцінах, музеях, у выніку архіўных пошукаў і вывучэння твораў У. І. Леніна нараджаліся апавяданні, аповесці пра самага Чалавечнага Чалавека...

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
16 красавіка 1987 года.
Зак. 1578.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ 9. ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ.